# Адкрываючы новыя даляглядыу знешнепалітычных даследаваннях Беларусі

## (да 65-годдзя Уладзіміра Еўдакімавіча Снапкоўскага)

*22 мая 2019 г. споўнілася 65 гадоў вядомаму беларускаму гісторыку, доктару гістарычных навук, прафесару кафедры міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Уладзіміру Еўдакімавічу Снапкоўскаму.*

Уладзімір Снапкоўскі нарадзіўся 22 мая 1954 г. у Віцебску. Яго бацька Еўдакім Афанасьевіч (1908—1984) удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне, быў кантужаны, пасля дэмабілізацыі працаваў пажарным, а маці Вера Іванаўна (1911—2000) выхоўвала пяцярых дзяцей (чатырох сыноў і дачку). У 1971 г. Валодзя скончыў сярэднюю школу № 20 г. Віцебска і паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Тут пачала складвацца яго асоба як гісторыка. У час вучобы найбольшы ўплыў на фарміраванне гістарычнага светапогляду таленавітага юнака аказалі прафесары Л.М.Шнеерсон, Р.М.Трухноў, дацэнт М.Г.Елісееў. Пасля заканчэння гістфака БДУ ў 1976 г. У.Снапкоўскі навучаўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі АН БССР (1976—1979 гг.).

У 1980 г. малады навуковец паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Палітыка ГДР у адносінах ФРГ — важны элемент разрадкі міжнароднай напружанасці (1970-я гады)". Яго навуковым кіраўніком быў прафесар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС доктар гістарычных навук В.Ц.Фамін — ураджэнец Беларусі, спецыяліст па знешняй палітыцы нацысцкай Германіі. У 1979—1993 гг. У.Снапкоўскі працуе ў Інстытуце гісторыі АН БССР — малодшым, старшым, вядучым навуковым супрацоўнікам, а ў 1982—1988 гг. — вучоным сакратаром Аддзялення грамадскіх навук АН БССР.

У 1993 г. У.Снапкоўскі абараніў доктарскую дысертацыю па тэме "Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1944—1953 гг.)" (кансультант — вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута расійскай гісторыі РАН, доктар гістарычных навук прафесар А.С.Пратапопаў).

З 1993 г. Уладзімір Еўдакімавіч працуе прафесарам кафедры міжнародных адносін, праз два гады ён атрымаў і навуковае званне прафесара. У 1995—2000 гг. загадваў аддзелам нацыянальных і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі (па сумяшчальніцтве). У пачатку 2000-х гг. у якасці запрошанага прафесара выкладаў у шэрагу польскіх навучальных устаноў.



*Уладзімір Снапкоўскі.* Фота 2015 г.

Прафесар У.Снапкоўскі — вядомы і аўтарытэтны беларускі даследчык гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі ў XX — пачатку XXI ст., адзін са стваральнікаў беларускай навуковай школы знешнепалітычнай гісторыі Беларусі, аўтар больш за 300 навуковых і навукова-папулярных прац (па гістарыяграфіі ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін, станаўленні сучаснай беларускай эліты, фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў), у тым ліку 11 манаграфій. Шэраг яго артыкулаў былі надрукаваныя за мяжой (у Аўстрыі, ЗША, Польшчы, Расіі, Украіне).

На пачатку 1990-х гг. ішло імклівае развіццё беларускай гістарычнай навукі і адукацыі. Свой істотны ўнёсак зрабіў і прафесар У.Снапкоўскі. Уладзімір Еўдакімавіч распрацаваў новую навуковую і вучэбную дысцыпліну "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі". Ён прапанаваў яе перыядызацыю, вызначыў аб'ект і прадмет, галоўныя кірунні даследаванняў, апісаў гістарыяграфічную традыцыю, сувязь з іншы-

мі гістарычнымі дысцыплінамі і гуманітарнымі навукамі, падвёў вынікі гістарычнага вопыту ажыццяўлення знешняй палітыкі беларускіх дзяржаў і дзяржаўных утварэнняў. Плённая праца ў адпаведным накірунку знайшла ўвасабленне ў вучэбных дапаможніках: "Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі" (ад пачаткаў дзяржаўнасці да пачатку XXI ст.) (Мн., 2003—2004, у 2 частках), "Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь (курс лекцый)" (Мн., 2007), "История внешней политики Беларуси" (Мн., 2013). Апошняя кніга — абноўленая і перапрацаваная рускамоўная версія беларускамоўнага выдання 2003—2004 гг. — выйшла ў серыі "Класічнае ўніверсітэцкае выданне". За падрыхтоўку цыкла вучэбных і навуковых работ па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі У.Е.Снапкоўскаму ў 2008 г. прысуджана прэмія Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя акадэміка У.І.Пічэты.

Важным дасягненнем беларускай гістарыяграфіі варта лічыць даследаванне прафесарам знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР у 1944—1953 гг., што знайшло адлюстраванне ў дзвюх манаграфіях — "Путь Беларуси в ООН" (Мн., 1994) і "Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі ў 1944—1953 гг." (Мн., 1994). У першай з іх упершыню ў гістарыяграфіі постсавецкіх дзяржаў ажыццёўлены аналіз праблемы першапачатковага членства рэспублік СССР (на прыкладзе Беларускай ССР і Украінскай ССР) у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. На падставе знешнепалітычных дакументаў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі, знешнепалітычнай дзейнасці БССР і УССР паказаны іх складаны шлях у лік дзяржаў — заснавальніц ААН. У.Е.Снапкоўскі адкрыў такія малавядомыя старонкі беларускай гісторыі, як дапамога Адміністрацыі дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый (ЮНРРА) БССР у 1945—1947 гг., перасяленне беларускага і польскага насельніцтва ў 1944—1948 гг., пазіцыя беларускай дэлегацыі ў ААН па пытаннях бежанцаў і перамешчаных асоб.

Уладзімір Еўдакімавіч плённа распрацоўвае праблематыку сучасных беларуска-расійскіх і беларуска-польскіх адносін, аб чым сведчаць асобныя манаграфіі, выдадзеныя ў апошнія гады. Так, у яго зборніку навуковых артыкулаў "Беларуска-расійскія адносіны" (Мн., 2009) разглядаюцца пытанні фарміравання і развіцця беларуска-расійскіх адносін у 1990-я і пачатку 2000-х гг., змешчаны навукова-аналітычныя агляды прэсы і выніковыя дакументы пасяджэнняў круглага стала беларускіх і расійскіх вучоных па актуальных і перспектыўных пытаннях двухбаковых адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. У выданні прадстаўлена аўтарская канцэпцыя беларуска-расійскіх адносін — канцэпцыя "стратэгічнага партнёрства" і саюзных адносін паміж дзвюма суверэннымі дзяржавамі пры захаванні імі статуса самастойных суб'ектаў міжнароднага права. У манаграфіі "Беларуска-польскія адносіны (1918—1989 гг.): Даследаванні, дакументы, ілюстрацыі і карты" (Мн., 2013) прадстаўлены ключавыя праблемы ўзаемаадносін паміж беларускім і польскім народамі на працягу амаль усяго XX стагоддзя. Гэта першае ў беларускай навуковай літаратуры даследаванне асноўных этапаў гэтых адносін і сувязяў, у якім прапанавана іх перыядызацыя ў 1944—1989 гг. Працягваючы вывучэнне праблематыкі, прафесар Снапкоўскі ў сваёй новай манаграфіі "Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны (1918—2017)" (Мн., 2017), спыніўся на паглыбленым даследаванні ключавых праблем узаемаадносін беларускага і польскага народаў на працягу стагоддзя, разглядаючы іх у шчыльным кантэксце міжнароднай палітыкі. Не абыходзячы вострых вуглоў, а наадварот, засяроджваючы на іх асноўную ўвагу, аўтар паказаў, што гэтыя адносіны ствараюць падставу для аптымістычнага погляду на будучыню двух суседніх народаў.

У сваёй навуковай дзейнасці У.Снапкоўскі шмат увагі надае падрыхтоўцы і выданню зборнікаў дакументаў і матэрыялаў па знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў XX — пачатку XXI ст. Сярод іх "Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў" (1914—1991 гг.)" у 4 тамах (Мн., 2008—2015), "Знешняя палітыка Беларусі (1996—2010 гг.)" (Мн., 2008—2014, т. 8—10), "Государственные границы Беларуси (1917—2010 гг.)" (Мн., 2012—2013, у 2 т.). У.Снапкоўскі быў адным са складальнікаў, перакладчыкам з англійскай, нямецкай і польскай моў, аўтарам ці адным з аўтараў уводзінаў і каментараў, адказным рэдактарам і членам рэдкалегіі гэтых унікальных прац. Яны атрымалі прызнанне спецыялістаў у Беларусі і за мяжой, шырока выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе ў ВНУ. Рэалізацыя гэтых трох праектаў, заказчыкам якіх з'яўлялася Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, мае вялікае навуковае і грамадска-палітычнае значэнне. Апублікавана больш за тры тысячы дакументаў і матэрыялаў з архіваў Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, Літвы, Польшчы і Расіі, а таксама з замежных выданняў, якія дагэтуль былі малавядомыя і цяжкадаступныя для беларускіх чытачоў. Дзякуючы гэтым зборнікам Беларусь атрымлівае важныя аргументы для ўмацавання сваёй гістарычнай і міжнародна-прававой ідэнтычнасці. У 2018 г. у выніку супрацоўніцтва У.Снапкоўскага з вядомым польскім гісторыкам Войцэхам Матэрскім у Варшаве пад грыфам Інстытута палітычных даследаванняў Польскай акадэміі навук выйшаў зборнік дакументаў і матэрыялаў "Польска-беларускі вузел", дзе сабрана больш за 500 архіўных і апублікаваных крыніц за 1918—1921 гг. (ад аднаўлення беларускай і польскай дзяржаўнасці да Рыжскага міру). У ім прадстаўлена багатая на падзеі і вельмі складаная і супярэчлівая па сваім змесце гісторыя беларуска-польскіх адносін у адзін з пераломных перыядаў XX ст.

Матэрыялы, вывады і абагульненні, прадстаўленыя ў публікацыях У.Снапкоўскага, увайшлі ў белару-



*Уладзімір Снапкоўскі з жонкай Святланай (таксама доктарам гістарычных навук).* Фота 2000 г.

скую і замежную навуковую і вучэбную літаратуру па гісторыі Беларусі, знешняй палітыкі і міжнародных адносін Беларусі XX — пачатку XXI ст., у энцыклапедычныя выданні, выкарыстоўваюцца на афіцыйным сайце Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Ён з'яўляецца адным з распрацоўшчыкаў Канцэпцыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, якая ўвайшла ў Закон Рэспублікі Беларусь "Аб зацвярджэнні асноўных кірункаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь" (2005).

Прафесару У.Снапкоўскаму даводзілася адстойваць інтарэсы нашай дзяржавы не толькі як даследчыку і лектару. На працягу шэрагу гадоў ён з'яўляўся членам групы беларускіх і польскіх гісторыкаў, што займалася выяўленнем і даследаваннем так званых "цяжкіх пытанняў" гісторыі беларуска-польскіх адносін, удзельнічаў ва ўсіх канферэнцыях, праведзеных гэтай групай у Беларусі і ў Польшчы. Дасягнутае ў выніку гэтых сустрэч збліжэнне пазіцый беларускіх і польскіх гісторыкаў па вострых пытаннях беларуска-польскіх адносін спрыяе паглыбленню даверу паміж народамі і паляпшэнню агульнай атмасферы ў адносінах паміж дзвюма суседнімі дзяржавамі.

Уладзімір Еўдакімавіч — член вучонага савета факультэта міжнародных адносін БДУ, член камітэта "Правазнаўства і міжнародныя адносіны" камісіі па вылучэнні работ на суісканне прэміі імя першага рэктара БДУ У.І.Пічэты, член рэдкалегій навуковых часопісаў па міжнародных адносінах у Польшчы і Украіне. З'яўляўся членам рэдкалегіі часопіса "Веснік БДУ" (серыя 3), членам спецыялізаваных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па гісторыі знешняй палітыкі і міжнародных адносін і па палітычных навуках пры БДУ. Ён падрыхтаваў чатырох кандыдатаў і аднаго доктара гістарычных навук. Прынцыповасць, патрабавальнасць і адначасова павага да вучняў, добразычлівасць, асабістая сціпласць і працавітасць — якасці, уласцівыя У.Е.Снапкоўскаму як педагогу і чалавеку.

Прафесар У.Снапкоўскі ўдзельнічаў у міжнародных навуковых канферэнцыях у Вялікабрытаніі, Германіі, Літве, Польшчы, Расіі, ЗША, Украіне, прайшоў навуковыя стажыроўкі ў Хумберсайдскім універсітэце (г. Хал, Вялікабрытанія), Інстытуце Гарымана Калумбійскага ўніверсітэта (Нью-Ёрк), Грынвічскім універсітэце (Лондан), Інстытуце міжнародных адносін Вроцлаўскага ўніверсітэта, Украінскім інстытуце міжнародных адносін, Дыпламатычнай акадэміі Міністэрства замежных спраў Расійскай Федэрацыі. У якасці ўдзельніка міжнароднага праекта "Фарміраванне эліты ў посткамуністычнай Еўропе" (галоўная арганізацыя — Мічыганскі ўніверсітэт, ЗША) выступіў з дакладам "Фарміраванне эліты ў постсавецкай Беларусі" (лістапад 1994 г., Мічыган). Стажыроўка ў Хумберсайдскім універсітэце дазволіла яму распрацаваць навучальны курс "Масавая і міжнародная камунікацыя", а навуковая стажыроўка (запрошаны вучоны) ў Інстытуце Гарымана Калумбійскага ўніверсітэта (Нью-Ёрк, ЗША) ажыццяўлялася ў межах урадавай праграмы ЗША "Актуальныя праблемы" (адміністратар — Міжнародны даследчы і адукацыйны савет, IREX). На міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і яе значэнне для Расіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Захаду" (Гарвардскі ўніверсітэт, красавік 1999 г.) беларускі навуковец выступіў з дакладам аб беларуска-расійскіх адносінах, а ў Грынвічскім універсітэце (Лондан) прыняў удзел у абмеркаванні праблемы "Стварэнне новых модуляў у еўрапейскіх даследаваннях". На міжнароднай канферэнцыі да 100-годдзя БНР (сакавік 2018 г., Лондан) ён выступіў з дакладам "БНР вачыма Лондана: па матэрыялах брытанскага Форын офіса (1918—1920 гг.)", дзе ўвёў у зварот шмат невядомых дагэтуль крыніц і дакументаў з Нацыянальнага архіва Вялікабрытаніі, у якім працаваў па праграме Еўрапейскага Саюза "МОСТ". Юбіляр з'яўляецца лаўрэатам прэміі імя акадэміка РАН В.А.Капцюга Сібірскага аддзялення РАН (2003) за выданне кнігі "Очерки истории белорусов Сибири".

***Рыгор Лазько**, прафесар Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук;*

***Святлана Свілас**, прафесар БДУ, доктар гістарычных навук*

***Сябры, калегі, вучні, рэдакцыя "Беларускага гістарычнага часопіса" жадаюць Уладзіміру Еўдакімавічу моцнага здароўя і новых творчых здзяйсненняў!***